■ Пра талерачкі

АД ДЭМАНАЎ ДА ПЛАЗМЫ

Незвычайныя тэорыі, звязаныя з НЛА

Калі вы цвёрда вырашылі ўбачыць НЛА, вы яго ўбачыце: у аблоках, яркіх планетах або засакрэчаных ваенных выпрабаваннях. У 1955 годзе генерал Дуглас Макартур у адной з публічных прамоў заявіў, што чалавецтва павінна аб'яднацца, каб у выпадку іншапланетнага ўварвання людзі змаглі даць адпор захопнікам.

Чаму ён гэта сказаў — невядома, аднак многія вырашылі, што існуе рэальная пагроза. Другая кучка фанатыкаў настойліва пераконвала навакольных, што Алімпійскія гульні 2012 года ёсць не што іншае, як змова іншапланецян і тайнага грамадства ілюмінатаў: яны нібыта мелі намер сабраць пабольш людзей у адным месцы і навязаць новы сусветны парадак.

На справе ж у навукі няма адназначных доказаў удзелу НЛА ў нашым жыцці або нават іх існавання. Аднак гэта не перашкаджае людзям прыдумляць усё новыя і часам усё больш пацешныя тэорыі.

ЯНЫ З БУДУЧЫНІ

Гэтая тэорыя была растыражыравана доктарам Брусам Голдбергам, гіпнатэрапеўтам, які лічыць сябе самым дасведчаным чалавекам у свеце ў пытаннях падарожжаў у часе. Ён сцвярджаў, што іншапланетныя караблі на самай справе — караблі людзей з будучыні, якія прылятаюць да нас, каб накіраваць наша развіццё ў патрэбнае рэчышча. Ён засноўваў сваю гіпотэзу на Рэндлшэмскім інцыдэнце з лятаючай талеркай, якая нібыта прызямлілася ў лесе. Пакінутыя ёю сімвалы ўяўлялі нешта накшталт паслядоўнасці з нулёў і адзінак: былі заўважаны Джымам Пеністанам, які запомніў іх. Джым адважыўся паказаць гэтыя сімвалы грамадскасці толькі ў 2010 годзе. Было вырашана, што яны прыйшлі да нас з поўдня Англіі, прыблізна з 8100 года.

ПЛАЗМАТЫЧНЫЯ СТВАРЭННІ

Паводле гэтай тэорыі, НЛА — зусім не механізм, а некаторыя нябесныя насельнікі, якія складаюцца, галоўным чынам, з плазмы. Гэтую тэорыю апісаў у сваёй кнізе Трэвар Джэймс Канстэбль у 1959 годзе. Ён лічыў, што вока не бачыць такіх стварэнняў, і яны могуць быць заўважаныя толькі праз інфрачырвоныя камеры. Пазней яго тэорыя была дапоўнена здагадкамі аб тым, што гэтыя істоты могуць жыць толькі ў самых жорсткіх умовах або ў адкрытым космасе. Акрамя таго, яны маюць патрэбу ў электраэнергіі, якая неабходная ім для ажыццяўлення рэпрадуктыўных функцый.

ДЭМАНЫ!

Знакі, знойдзеныя ў колах на палях, былі аднесены не толькі да Кабалы, але і непасрэдна да дэманічнай мовы. Маўляў, НЛА — прадвеснікі Апакаліпсісу, выкрадзеныя іншапланецянамі людзі будуць вымушаны ўступаць з імі ў нейкую сексуальную сувязь ці далучацца да грахоўных дзеянняў іншага кшталту, што вельмі нагадвае сітуацыю з палымі анёламі, якая мела месца перад вялікім патопам, што спарадзіў расу гігантаў. Місія іншапланецян заключаецца ў тым, каб, з'яўляючыся гасцямі з космасу, аслабіць веру чалавецтва ў Бога і падрыхтаваць нас да прыходу іх дэманічнага культу.

ГЭТА АРХОНТЫ?*

У бібліятэцы старажытных гнастычных тэкстаў Наг-Хамадзі** знойдзены дакумент, які апісвае групу

нейкіх стварэнняў. Яны з'явіліся ў працэсе зараджэння Сонечнай сістэмы ў выніку ўзніклай плазматычнай хвалі і цяпер сілкуюцца нашымі эмоцыямі. Тэарэтыкі апісваюць два тыпы гэтых стварэнняў: адны вонкава нагадваюць эмбрыён, а іншыя знешне падобныя да рэптылій. Яны маюць лепшыя тэхналогіі, чым мы, валодаюць тэлепатыяй, падарожнічаюць у часе і заклікаюць нас верыць у багоў. Верагодная мэта іх існавання і цікавасці да людзей — кіраванне намі.

** Духі-светакіраўнікі. У гнастычных уяўленнях архонты разглядаюцца як творцы матэрыяльнага космасу, а заадно і сістэмы інстынктаў і эмоцый, якія робяць чалавека рабом.*

*** Збор рукапісных кніг (кодэксаў), выраблены з папірусу, які быў знойдзены ў канцы 1945 года ў раёне аднайменнага паселішча ў Егіпце. Тэксты ў гэтых кнігах датуюцца I—III ст. н. э.*

НЛА ВЫКРАДАЮЦЬ САМАЛЁТЫ

Пасажырскі лайнер MH370 знік з радараў падчас палёту над Паўднёва-Кітайскім морам 8 сакавіка 2014 года. Калі самалёт страціў сувязь з дыспетчарскай, ваенны радар усё яшчэ адсочваў яго шлях, які, дарэчы, быў зменены, у выніку чаго самалёт апынуўся над Андаманскім морам, дзе і знік. Менавіта тады чуткі пра выкраданне самалёта НЛА пачалі набіраць папулярнасць. У гэта асабліва лёгка было паверыць з прычыны паведамленняў ад ваенных, згодна з якімі на радары перад знікненнем самалёта з'явіўся нейкі неапазнаны лятаючы аб'ект, а ў месцы знікнення не было знойдзена ніякіх абломкаў. Гэтая версія з'яўляецца беспадстаўнай хоць бы таму, што рэшткі самалёта пасля ўсё ж былі знойдзеныя на востраве Рэюньён.

ГЭТА ЎСЁ АМЕРЫКАНЦЫ!

У 2001—2002 гадах Гары МакКінан узламаў камп'ютары НАСА і Ваеннага дэпартамента ЗША ў пошуках інфармацыі аб іншапланецянах. Ён быў апошнім, каму ўдалося ўзламаць камп'ютарную сістэму ўзброеных сіл Штатаў. Дык вось ён сцвярджаў, што быў захоплены нейкі касмічны карабель, які пасля быў пераабсталяваны з мэтай удасканалення антыгравітацыйнага поля і тэрмадынамічнага патэнцыялу. У дакуменце, канфіскаваным з дзяржаўнага дэпартамента ЗША, гаворыцца аб нейкай Праграме кантролю сонечнай сістэмы, якая мае на ўвазе наяўнасць сакрэтнага флоту касмічных караблёў пад кіраўніцтвам ААН, а таксама ўдзел шэрагу іншых краін у выпадку міжпланетнага канфлікту.



ГАЛАГРАМА ДЛЯ... ПАДМАНУ СВЕТУ

Гэтая тэорыя атрымала сваё распаўсюджванне ў 2009 годзе, калі ў небе над Нарвегіяй паўстала блакітнае свячэнне. Нягледзячы на тое, што падобная з'ява — не рэдкасць у гэтых месцах, некаторыя людзі патлумачылі сітуацыю наступным чынам: ім падалося, што форма свячэння не натуральная, а значыць, яно не прыроднага, незямнога паходжання. Адны выказалі версіі аб выпрабаванні нейкай рускай зброі, але неўзабаве знайшліся і іншыя, хто ўзгадаў праект «Blue beam» і Сержа Манаста, які калісьці заявіў, што ААН, Міністэрства абароны ЗША і НАСА сумесна з універсітэтам Аляскі праектуюць велізарную галаграму, якая заклікана дапамагчы ім усталяваць новы сусветны парадак. Нібыта яны сабраліся спраецыраваць «уварванне» іншапланецян і вялізную постаць «бога», які абяцае ўсеагульнае выратаванне.

ВЫНАХОДНІЦТВА НАЦЫСТАЎ

Заснавальнік гэтай тэорыі — Эрнст Цюндэль, які заявіў, што лятаючыя караблі не проста былі пабудаваны Трэцім рэйхам сумесна з неіснуючым грамадствам медыумаў «Урыл», але нават устанавілі кантакт з іншапланецянамі, якія насялялі сістэму Альдэбаран. Калі нацысты прайгралі вайну, яны перамясцілі свае даследаванні ў Антарктыку і працягнулі іх з дапамогай высокаразвітой цывілізацыі, якая жыве ў поласцях зямной кары. У 1946 годзе амерыканцы разгарнулі маштабную кампанію ў Антарктыцы нібыта з мэтай выяўлення нямецкіх войскаў, якія адступалі, але на самай справе яны хацелі знішчыць нацысцкія эксперыментальныя базы. Так што ўсё, што цяпер застаецца, — чакаць, калі з Антарктыкі на лятаючых талерачках прыляцяць нацысцкая армія і пачне трэцюю сусветную вайну. Хоць пра гэта ўжо знялі фільм пад назвай «Жалезнае неба», праўда, там нацысты схаваліся на Месяцы. Кінастужка, дарэчы, з'яўляецца фантастычнай баевіком-камедыяй, як, верагодна, і гэтая тэорыя.

■ Навука

НАСА РАСКАЗАЛА ПРА АТМАСФЕРУ МАРСА

Навукоўцы НАСА прадставілі вынікі чатырох новых даследаванняў атмасферы Марса, праведзеных на аснове інфармацыі зонда MAVEN (назва расшыфроўваецца як Mars Atmosphere and Volatile Evolution — эвалюцыя атмасферы і лятучых рэчываў на Марсе). Аб новых адкрыццях у «лёсе атмасферы» Чырвонай планеты, анансаваных НАСА 4 лістапада 2015 года, паведамляецца ў часопісе Science.

Вымярэнні ў верхніх пластах атмасферы Марса паказалі, што хуткасць убягання іонаў павялічваецца падчас сонечных успышак. 8 сакавіка 2015 года, падчас магутнага выкіду каранальнага рэчыва на Сонцы, прыборы MAVEN зафіксавалі з'явы Фарадзея (магнітнае кручэнне плоскасці палярызацыі), якія выцягваліся ў космас у выглядзе завіткоў вышынёй пад 5000 кіламетраў. Калі наступствы выкіду дасягнулі Марса, па гэтых завітках у вялікай колькасці пабеглі планетарныя іоны, найперш O_2+ і CO_2+. Паколькі ў ранняй гісторыі Сонечнай сістэмы каранальныя выкіды масы здараліся значна часцей, чым цяпер, гэта паказвае на верагодную прычыну страты планетай сваёй атмасферы.

Аўтары другога даследавання распавялі пра апусканне MAVEN у тэрмасферу і іанасферу планеты. Там зонд выявіў змешванне двухвокісу вугляроду, аргону і дыяксіду азоту, а таксама нечакана вялікую колькасць кісларода. Шчыльнасць гэтых элементаў на вышыні 200 кіламетраў падчас кожнага з апусканняў аказвалася рознай, што можа быць выклікана ўзаемадзеяннем гравітацыйных хваль і ветру.

Акрамя таго, навукоўцы распавялі аб нядаўна заўважаным на Марсе на вышыні 60 кіламетраў ззянні. На іх думку, яно па сваёй прыродзе не адрозніваецца ад палярнага ззяння на Зямлі — толькі на Марсе выклікана не магнітнымі полюсамі, а рэшткавым магнітным полем кары планеты. Таму «марсіянскае ззянне» больш рассеянае і раўнамерна размеркавана ў атмасферы.

Астрафізікі прааналізавалі размеркаванне часціц пылу на розных вышынях (ад 150 да 1000 кіламетраў). Ні адзін прыродны працэс, які адбываецца на паверхні планеты, не здольны падняць пыл на такую вышыню. На думку навукоўцаў, MAVEN знайшоў пыл міжпланетнага паходжання.

Акрамя таго, у часопісе Geophysical Review Letter выйшла цэлых 44 артыкулы, якія падымалі больш дробныя, але важныя для навукі пытанні, на якія ўдалося адказаць дзякуючы звесткам з MAVEN.

■ Дайджэст

«МІКРАРЫБКІ» ПАЧЫСЦЯЦЬ КРОЎ АД ТАКСІНАЎ



Нягледзячы на засцярогі некаторых фантастаў, навукоўцы ўжо шмат гадоў мараць пра маленькіх робатаў, якія змогуць працаваць унутры нашых цел. Даследчыкі з Універсітэта Сан-Дыега прасунуліся ў гэтым пытанні далей за іншых: нядаўна яны выступілі з прапановай стварацьь «мікрарыбак», якія будуць «плаваць» у крыві і чысціць яе ад таксінаў.

Каманда даследчыкаў распрацавала метад 3D-друку пад назвай «мікрамаштабны бесперапынны аптычны друк», які дазволіць на працягу некалькіх секунд стварыць сотні рыбападобных ботаў таўшчынёй, меншай за чалавечы волас. Распрацаваны прынтар можа стварацьь аб'екты рознай формы і дадаваць да іх наначасціцы, якія выконваюць розныя функцыі, дзякуючы мільёнам мікралюстэркаў, што праецыруюць ультрафіялетавае святло на фотаадчувальныя матэрыялы.

Напрыклад, плацінавыя наначасціцы ў «хвасце» робата будуць рэагаваць з перакісам вадароду і перамяшчаць яго ў прасторы, а вокіс жалеза ў яго «галаве» дазволіць даследчыкам кіраваць рухамі робата з дапамогай магнітаў. Як толькі боты дасягнуць патрэбнага месца, будзе зроблена выдаленне таксінаў. Каб пераканацца, што ўсё спрацавала як трэба, распрацоўшчыкі дадалі злучэнне наначасціц, якое выдаляе пчаліны яд з арганізма. Паколькі ў выніку гэтай рэакцыі злучэнне пачынае свяціцца, даследчыкі змаглі ацаніць эфектыўнасць працы ботаў, замяраючы інтэнсіўнасць светлавога выпраменьвання.

Сістэма таксама патэнцыйна здольная дастаўляць лекі ў патрэбную частку цела. Каманда даследчыкаў спадзяецца стварыць у выніку «хірургічных мікработаў, якія змогуць дзейнічаць выключна бяспечна і дакладна», хоць на сёння такія боты былі апрабаваны толькі на мышах. Тым не менш, тэхналогія мікралюстэркаў, якая была распрацавана для друку «рыбак», з'яўляецца перспектыўнай: яна можа быць адаптавана для стварэння розных патрэбных мікрапрылад.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*